Шніп, М.А. Пытанне уніі ў стасунках Вялікага княства Літоўскага і Польскага каралеўства ў пачатку XYI ст. / М. А. Шніп // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. Вып. 2 / рэдкал. У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.] – Мн: БДУ, 2007. – С. 163–166.

***М. А. ШНІП***

# ПЫТАННЕ УНІІ Ў СТАСУНКАХ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА І ПОЛЬСКАГА КАРАЛЕЎСТВА Ў ПАЧАТАКУ XVI ст.

XVI ст. пачалося для Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ) чарговай вайной з Маскоўскай дзяржавай. У канцы чэрвеня 1501 г. падчас ваенных дзеянняў да вялікага князя літоўскага Аляксандра прыйшла вестка аб смерці брата — польскага караля Яна Ольбрахта, а таксама запрашэнне на элекцыйны сойм у Пётркаў [1]. Карона Польшчы магла б даць ВКЛ вайсковую і



фінансавую дапамогу, што б прыйшлося вельмі дарэчы ў зацятай барацьбе з Масквою, таму Аляксандр хутка выправіўся ў Пётркаў. На польскі трон прэтэндавалі таксама браты вялікага князя: Уладзіслаў — венгерскі і чэшскі кароль, Жыгімонт — глогаўскі князь [2]. Перамагла, аднак, кандыдатура Аляксандра, бо для Кароны Польскай прадстаўлялася новая магчымасць ажыццявіць свой даўні план па далучэнні ВКЛ. Пасля смерці Казіміра і абрання на троны ВКЛ і Польшчы Аляксандра і Яна Ольбрахта персанальная унія паміж дзвюма дзяржавамі сарвалася, таму палякі паспрабавалі такую магчымасць выкарыстаць, тым больш што знешнепалітычныя абставіны спрыялі гэтаму.

У дзень абрання вялікага князя літоўскага польскім каралём, 3 кастрычніка, у Пётркаве быў падпісаны дагавор, які прадугледжваў заключэнне *рэальнай* уніі паміж дзвюма дзяржавамі. Яго падпісаў сам Аляксандр, дэлегацыя польскага сената, а таксама прадстаўнікі рады ВКЛ: біскуп віленскі Войцэх Табар, ваявода троцкі Ян Забярэзінскі, Мікалай Мікалаевіч Радзівіл, князь Аляксандр Гальшанскі і кухмістр Пятро Аляхновіч [3]. Урачыстае падпісанне акта уніі, а таксама элекцыйнага дэкрэта адбылося 23 кастрычніка ў Мельніку. У гэтым акце гаварылася, што ВКЛ і Польшча «аб'ядноўваюцца і злучаюцца ў адно непадзельнае і аднароднае цела, каб існаваў адзін народ, адно племя, адно брацтва і супольныя нарады, а цела тое каб мела адну галаву, адзінага караля і адзінага гаспадара»[4].

Паводле Мельніцкага акта, які падпісалі 27 прадстаўнікоў ВКЛ, манарх у аб'яднанай дзяржаве павінен быў абірацца на супольным сойме ў Пётркаве. Прычым дэлегацыя ВКЛ абмяжоўвалася б каталіцкімі біскупамі, трыма ваяводамі і двума кашталянамі, што амаль пазбаўляла іх уплыву на выбар пры значна большым прадстаўніцтве палякаў. Акрамя гэтага, павінны былі ажыццяўляцца супольныя нарады па важнейшых пытаннях унутранай і знешняй палітыкі, планавалася ўвесці адзіную грашовую сістэму. Найбольш важным было тое, што Ягелоны гублялі свае спадчынныя правы на трон у ВКЛ, паколькі пасада манарха ў аб'яднанай дзяржаве павінна была стаць выбарнай.

Мельніцкі акт быў дапоўнены так званым Мельніцкім прывілеем, падпісаным каралём двума днямі пазней, паводле якога значна вырастала роля польскага сената. Без яго згоды дзеянні караля не мелі юрыдычнай сілы. Пры парушэнні дзяржаўных актаў каралём сенат меў права дэтранізавання і абрання новага ўладара . Прывілей гэты можна параўнаць з агульназемскім прывілеем Аляксандра ў ВКЛ 1492 г., бо мелі яны фактычна аднолькавае значэнне — абмежаванне ўлады манарха на карысць магнатэрыі. Аднак, калі прывілей польскаму сенату ў 1505 г. адышоў у нябыт, то земскі прывілей



1492 г. быў пацверджаны ў 1506 г. Жыгімонтам Старым і паступова набыў рэальную моц.

Такім чынам, Мельніцкая унія з Польшчай, спадчыннае трыманне Ягелонамі ВКЛ і Мельніцкі прывілей сенату былі тым коштам, які заплаціў Аляксандр, каб атрымаць дапамогу супраць Масквы і яе саюзнікаў. Але Мельніцкі акт у сваім змесце меў пункт, згодна з якім сойм ВКЛ павінен быў зацвердзіць унію з Польшчай [6]. Гэта ў далейшым дало падставы ВКЛ фактычна дэнансаваць Мельніцкае пагадненне.

Яшчэ падчас вайны з Масковіяй, пасля таго як Заволжская Арда, саюзнік ВКЛ, спыніла сваё існаванне і становішча княства стала горшым, Аляксандр папярэджваў у сваіх лістах польскіх магнатаў, што калі чаканні сапраўднай дапамогі акажуцца дарэмнымі, то ВКЛ будзе лічыць сябе вольным ад абавязкаў, прынятых у 1501 г. [7] Пасля заключэння перамір'я з Масковіяй на польскі сойм у Любліне было накіравана пасольства з ВКЛ на чале з Міхалам Глінскім, якое выказвала рэзкія папрокі ў адрас сената з прычыны

недастатковай дапамогі ў вайне з Масковіяй, а таксама супраць крымскіх татараў, набегі якіх на паўднёвыя землі ВКЛ працягваліся . На патрабаванне прадстаўнікоў Вялікага княства даць канкрэтны адказ на гэта пытанне палякі выслалі сваё пасольства ў ВКЛ з запрашэннем паноў-рады на супольную нараду на сойме ў Пётркаве ў студзені 1504 г., спасылаючыся на пастановы Мельніцкага акта [9]. Але для ВКЛ унія перастала мець значэнне: вайна была завершана з вялікімі стратамі, дапамогі з Польшчы фактычна не было ды й пазбаўленне Ягелонаў спадчыннага трона ніяк не апраўдвалася. І гэта ва ўмовах таго, што Аляксандр не меў дзяцей, у Еўропе працягвалася супрацьстаянне Уладзіслава Ягелона з імператарам Максіміліянам І Габсбургам, а на трон ВКЛ мог прэтэндаваць і маскоўскі князь. Уладзіславу ў гэты час было вельмі важна, каб на троне польскім і ў ВКЛ сядзелі яго саюзнікі, на ролю якіх лепш за ўсё падыходзілі самі Ягелоны. Але паводле Мельніцкага акта Аляксандр мог стаць і апошнім Ягелонам з велікакняжацкай каронай. Таму з 1504 г. Уладзіслаў і Аляксандр імкнуліся забяспечыць перадачу ўлады ў ВКЛ свайму малодшаму брату Жыгімонту, князю глогаўскаму і апаўскаму, а з 1504 г. — намесніку ў Сілезіі. А велікакняжацкі пасад значыў і палову поспеху ў выпадку выбараў караля польскага.

Такая палітыка Ягелонаў патрабавала пераадолець супраціў галоўных ініцыятараў мельніцка-пётркаўскіх пактаў, таму Аляксандр стаў на падтрымку новых польскіх родаў, пераважна велікапольскіх, у супрацьвагу магнатам з Малапольшчы [10]. Інакш справа абстаяла ў княстве. Прыхільнікаў уніі тут было значна менш, сярод іх з упэўненасцю можам назваць толькі Яна Заберазінскага з герба «Ляліва», звязанага з малапалянамі, і віленскага



біскупа Войцэха Табара, які знаходзіўся ў напружаных адносінах з Аляксандрам, бо не падтрымліваў ідэю царкоўнай уніі, што песціў вялікі князь, і актыўна выступаў за незалежнасць сваёй дыяцэзіі ад свецкай улады [11]. Ягелоны ж у справе забеспячэння спадчыннасці трона ВКЛ дынастыі вырашылі абаперціся ў першую чаргу на М. Глінскага.

Сойм ВКЛ, які праходзіў у лютым 1505 г. у Бярэсці, не ратыфікаваў Мельніцкую унію, прычым Аляксандр «не дапусціў да рады» Войцэха Табара і Яна Заберазінскага [12]. Немагчымасць вяртання да першапачатковага акта рэальнай уніі стала відавочнай пасля аднаасобнага (без удзелу афіцыйнай дэлегацыі з Польшчы) абрання вялікім князем літоўскім Жыгімонта Старога восенню 1506 г. [13] І ўжо ў якасці вялікага князя літоўскага Жыгімонт быў абраны ў снежні таго ж года каралём польскім. Такім чынам адбылося ўсталяванне новай персанальнай уніі паміж дзяржавамі. Заключэнне ж рэальнай уніі, якой павінна была стаць Мельніцкая, але на практыцы ператварылася ў персанальную, адбылося больш чым на паўстагоддзя пазней.

---

1 Литовская метрика (ЛМ). Кн. 5 (1427—1506). Книга записей 5 / Подгот. А. Банёнис. Вильнюс, 1995. № 115.

2 *Kolankowski L.* Polska Jagiellonów. Dzieje polityczne. Lwów, 1936. S. 174.

3 *Pietkiewicz K.* Wielkie Księstwo Litewskie pod rządami Aleksandra Jagiellończyka. Poznań, 1995. S. 121.

4 Akta unii Polski z Litwą, 1385 — 1791. Kraków, 1932. S. 143.

5 *Грыцкевіч А.* Мельніцкі прывілей 1501 г. // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 5. Мн., 1999. С. 111.

6 Akta unii Polski z Litwą... S. 146.

7 *Halecki O.* Dzieje Unii Jagiellońskiej. T. II (w XVI wieku). Kraków, 1920. S. 21.

8 Akta Aleksandra króla polskiego, wielkiego księcia litewskiego i t. d. (1501—1506) wydał Fryderyk Papee. Kraków, 1927. № 215.

9 Ibid.

10 *Kolankowski L.* Op. cit. S. 183.

11 *Pietkiewicz K.* Op. cit. S. 123.

12 Akta Aleksandra... № 254.

13 ЛМ. Кн. 8 (1499—1514). Книга записей 8 / Подгот. А. Балюлис, Р. Фирковичюс, Д. Антанавичюс. Вильнюс, 1995. № 1, 3.